КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД

Перакладзіце з рускай мовы на беларускую наступныя словы:

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5. Погост. **6.** Блаженство, наслаждение. **8.** Необыкновенно. **11.** Ухват. **14.** Аист. **15.** Банкрот. **16.** Подберезовик. **17.** Разделочная дощечка. **20.** Что-то, нечто. **22.** Рюмка, стопка. **23.** Звезда. **26.** Определение (лингв.) **27.** Вредитель. **28.** Минута.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Цветник, палисадник. **2.** Ирис (бот.) **3.** Сплавщик. **4.** Можжевельник. **7.** Привычка, повадка. **9.** Копилка, кубышка. **10.** Свекловод. **12.** Слишком, чересчур. **13.** Голубика. **18.** Остаток. **19.** Кружево. **21.** Алчно, жадно. **24.** Жасмин. **25.** Жатва.

Склала Таццяна КУЗЬМІЧ,
г. Віцебск.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА,
АДКАЗЫ.
ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5. Цвінтар. **6.** Асалода. **8.** Надзвычайны. **11.** Відкі. **14.** Бусел. **15.** Банкрут. **16.** Абабак. **17.** Дыўшка. **20.** Штосьці. **22.** Чарка. **23.** Зорка. **26.** Азначэнне. **27.** Шкоднік. **28.** Хвіліна.
ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Кветнік. **2.** Касач. **3.** Асач. **4.** Ядловец. **7.** Звычка. **9.** Скарбонка. **10.** Буракавод. **12.** Занадта. **13.** Дурніцы. **18.** Астача. **19.** Карункі. **21.** Скавана. **24.** Язмін. **25.** Жніво.

■ Родныя тапонімы

«НАШЧАДКІ МАСІЛА»

Прашу расказаць гісторыю паходжання назвы вёскі Масілавічы, якая знаходзіцца ў Слонімскім раёне Гродзенскай вобласці, і рэчанькі Грыўда, якая цячэ недалёка ад яе. Там знаходзіцца мая малая радзіма, але па волі лёсу цяпер бываю ў тых мясцінах даволі рэдка. Таксама, калі магчыма, растлумачце пра назву вёскі Новыя Дзявяткавічы таго ж раёна, куды я хадзіў у школу.

З цікавасцю чытаем кожны нумар вашай газеты. Асабліва падабаецца, што артыкулы напісаны на нашай роднай мове, якой мы вельмі ганарымся.

Мікалай Міхайлавіч Русак і яго сям'я,
горад Мінск.

На вашы пытанні адказвае Ганна Міхайлаўна МЕЗЕНКА, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчыца кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава.

Дакладна паходжанне назвы вёскі *Масілавічы* Новадзявяткавіцкага сельсавета Гродзенскай вобласці невядома, хоць і даволі празрыстае па структуры. У аснове назвы *Масіл* — скарочаны варыянт размоўнага асабовага мужчынскага імені *Масілей*, якое А.В.Суперанская ў «Слоўніку народных формаў рускіх імёнаў» узводзіць да царкоўнага імені *Василий*, а больш дакладна, да ўтворанага ад яго прозвішча *Масілаў*. Суфікс -іч-ы патранімічны, звычайна афармляе тапонімы, звязаныя з імёнамі продкаў, і сведчыць, што гэтую вёску заснавалі і ў ёй жылі нашчадкі некага Масіла.

Назва *Новыя Дзявяткавічы* таго ж раёна ўтворана ад прозвішча *Дзявяткаў*, якое, у сваю чаргу, узыходзіць да аднаго са старажытных імён, якія даваліся па парадку і часе нараджэння дзіцяці — *Дзявятка* (параўн.: Первой, Трацяк і інш.). Патранімічны суфікс -іч-ы, як ужо адзначалася, сведчыць, што вёску заснавалі ці на землях Дзявяткаў жылі іх нашчадкі.

Што да назвы ракі *Грыўда*, то найбольш верагодна, на думку В.А. Жучкевіча, аўтара «Кароткага тапанімічнага слоўніка Беларусі», балтыйскае паходжанне ад той жа назвы, што і латышскае griva — вусце або літоўскае grivimas — падзенне, скіданне. Даследчык спасылаецца на працу літоўскага і рускага мовазнаўцы К.Буга 1923 года, які сцвярджае, што фармант *-да* тыповы для паўднёва-ўсходняй ускраіны балтыйскай тапаніміі

Даты Падзеі Людзі

26 МАЯ

1910 год — нарадзіўся (г. Берлін) Эдзі Рознер, кампазітар, аранжыроўшчык, джазавы трубач, заслужаны артыст Беларусі (1944). Валодаў віртуозным ігрой на трубе. З 1939 года жыў у СССР. У 1940-м быў кіраўніком Дзяржаўнага джаз-аркестра БССР. У 1946 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1954-м. Кіраваў эстраднымі аркестрамі Масквы, з 1969-га — аркестрам Гомельскай абласной філармоніі, з 1972 года жыў у Заходнім Берліне. Аўтар шматлікіх папулярных песень, танцавальных мелодый. Памёр у 1976 годзе.

1926 год — па ініцыятыве З. Бядулі, У. Дубоўкі, К. Крапівы, К. Чорнага створана Беларускае літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Узвышша» — суполка беларускіх пісьменнікаў. У сваёй дзейнасці яе сябры арыентавалася на рускую літаратурную арганізацыю «Перавал». У праграмных тэзісах «Узвышша» абвяшчалася стварэнне літаратуры, арыентаванай на нацыянальны фальклор і класіку, зацвярджалася прынцыповае значэнне прафесіяналізму пісьменніцкай работы і ўстаноўка на развіццё культуры мовы, злучэнне рэалістычных традыцый з наватарствам. Многія тэарэтычныя палажэнні, распрацаваныя А. Бабарэкам (стварэнне станоўчага вобразу «новага чалавека», адлюстраванне «горада як нацыянальнага прадстаўніка краіны»), не знайшлі адлюстравання ў мастацкай практыцы празаікаў «Узвышша», што сведчыць пра наяўнасць у арганізацыі двух ідэйных напрамкаў. Пасля абвінавачванняў у нацыяналізме і арышту некаторых членаў «Узвышша» на агульным сходзе ў 1931 г. было прынята рашэнне аб ліквідацыі аб'яднання.

1926 год — 90 гадоў таму нарадзіўся (г. Барысаў) Ілья Львовіч Курган, беларускі акцёр, дыктар, заслужаны артыст Беларусі (1968). У 1949 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працаваў на Беларускім радыё, з 1959 года выкладаў у Беларускай акадэміі мастацтваў і Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў. Яго майстэрства чытальніка выявілася ў радыёпастаноўках «Паляўнічае шчасце» Э. Самуйленка, «Прымакі» Я. Купалы, «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча імногіх іншых.



Было сказана

Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:
«Самае галоўнае — не страціць усведамлення сваіх памылак».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.51	21.24	16.33
Віцебск —	4.33	21.20	16.47
Магілёў —	4.41	21.14	16.33
Гомель —	4.45	21.02	16.17
Гродна —	5.07	21.37	16.30
Брэст —	5.16	21.30	16.14

Месяц

Поўня 22.05–28.05.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Ірыны, Аляксандра, Васіля, Георгія, Макара, Сяргея, Яфіма.*
К. *Марыяны, Паўліны, Эвеліны, Паўла, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Муж — жонцы:
— Дарагая, пойдзем грашыць на кухню.
— Ты любіш секс у нечаканых месцах?
— Я проста заву цябе сала на ноч паесці...

Кірмаш, дзяўчына пытаецца ў прадаўца:
— Пачым вунь той прыгожы кажушок?
Той:
— Адна ноч кахання, прыгажуня!

Дзяўчына паварочваецца да вялікага і дужага хлопца, які стаіць непадалёк:
— Віця, расплаціся.

Прыйшоў у госці на гарбату — налілі віскі. Адразу зразумела: тут любяць і чакаюць.

Схаваны мікрафон у чарзе да лагапеда дазваляе стварыць да 600 найменняў мэблі «Ікеа» штодзень.



Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2022. Нумар падпісаны ў 19.30 25 мая 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12